**Установа адукацыі**
**"Беларускі дзяржаўны педагагічны**
**Універсітэт імя Максіма Танка "**
**Інстытут інклюзіўнай адукацыі**

**Вучэбная дысцыпліна «Лагапедычная рытміка»**

# Агульнадыдактычныя прынцыпы лагарытмікі

Вячорка І. В.,
старшы выкладчык кафедры
лагапедыі

# Агульнадыдактычныя прынцыпы лагарытмікі

- Прынцып сістэматычнасці
- Прынцып свядомасці і актыўнасці
- Прынцып нагляднасці
- Прынцып даступнасці і індывідуалізацыі
- Прынцып паступовага павышэння патрабаванняў

# Прынцып сістэматычнасці

Паслядоўнасць выкладу матэрыялу ўсяго курсу лагапедычнай рытмікі, суаднясенне тэарэтычных палажэнняў і іх практычнай распрацаванасці, раскрыццё тэм курсу і размеркаванне матэрыялу ўнутры іх.

Бесперапыннасць, рэгулярнасць, планамернасць карэкцыйнага працэсу. Паўтарэнне выпрацоўваемых рухальных навыкаў.

Для эфектыўнага паўтарэння неабходна засвоенае спалучаць з новым, каб працэс паўтарэння насіў варыятыўны характар: змяненне практыкаванняў, умоў выканання, разнастайнасць прыёмаў, адрозненні ў змесце заняткаў.

# Прынцып свядомасці і актыўнасці

Свядомае і актыўнае стаўленне дзіцяці, дарослага (у дачыненні да заіклівых дзяцей пачынаючы са школьнага ўзросту) да сваёй дзейнасці.

Самастойная, актыўная дзейнасць дзіцяці знаходзіцца ў залежнасці ад узнікнення цікавасці да прапанаванага задання, свядомага яго ўспрымання, разумення мэты і спосабу выканання.

# Прынцып нагляднасці

Шырокае ўзаемадзеянне паказчыкаў ўсіх аналізатараў. Фарміраванне рухаў у спалучэнні са словам і музыкай, вывучэнне іх узаемасувязі ажыццяўляецца з паказчыкамі ўсіх рэцэптараў.

Непасрэдная зрокавая нагляднасць разлічана на ўзнікненне эстэтычнага ўспрымання, канкрэтнага прадстаўлення руху, правільнага рухальнага адчування і жадання яго прайгравання.

Акрамя непасрэднай нагляднасці, вялікую ролю адыгрывае апасродкаваная нагляднасць, калі неабходна патлумачыць асобныя дэталі і механізмы руху, якія схаваны ад непасрэднага ўспрымання.

# Прынцып даступнасці і індывідуалізацыі

Ўлік узроставых асаблівасцяў і магчымасцяў асоб з маўленчымі парушэннямі.

Неабходнай умовай для захавання прынцыпу індывідуалізацыі з'яўляецца папярэдняе высвятленне характару паталагічнага працэсу: этіапатагенетычнае, сімптаматычнае, дыягнастычнае абследаванні, а таксама ўдакладненне рэабілітацыйнага патэнцыялу чалавека, які займаецца.

Індывідуальны падыход прадугледжвае таксама ўлік тыпу вышэйшай нервовай дзейнасці, ўзросту, полу, прафесіі, рухальнага статусу.

# Прынцып паступовага павышэння патрабаванняў

Вызначае пастаноўку перад людзьмі, якія займаюцца, больш цяжкіх новых заданняў: рухальных, музычных, славесных.

У працэсе іх выканання пашыраецца і ўзбагачаецца аб'ём рухальных уменняў і навыкаў, удасканальваецца адвольная і маўленчая маторыка, нармалізуюцца тэмп і рытм прамовы ў адпаведнасці з зададзеным музычным тэмпам і рытмам.

Пераход да новых заданняў ажыццяўляецца паступова, па меры замацавання фарміруючых навыкаў.

# Літаратура


- Волкова, Г. А. Логопедическая ритмика : учебник для студ. вузов / Г. А. Волкова. - М. : ВЛАДОС, 2010. - 272 с.
- Кочарян, А.А. Логопедическая ритмика: учебно-методическое пособие / авт. – сост. А.А. Кочарян. – Минск :БГПУ, 2008. – 52 с.
- Филатова, Ю.О., Гончарова, Н.Н., Прокопенко, Е.В. Логоритмика: Технология развития моторного и речевого ритмов у детей с нарушениями речи: Учебно-методическое пособие / под редакцией Л.И. Беляковой. – М.: Национальный книжный центр, 2017. – 208 с.